# СУЧАСНАЯ НАВУКОВАЯ І ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА ПА ГІСТОРЫІ ДРУКУ: ПАДЫХОДЫ ДА РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ МАТЭРЫЯЛУ

**Н. А. Зубчонак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*

У артыкуле прадстаўлены агляд сучаснай навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры па гісторыі беларускага друку; вызначаны асаблівасці метадалагічнага падыходу да асэнсавання факталагічнага матэрыялу, гістарычных з’яў і працэсаў.

***Ключавыя словы:*** друк; журналістыка; сродкі масавай інфармацыі; гісторыя; перыяд; даследаванне; вучэбна-метадычны комплекс; метадалагічны падыход.

# MODERN SCIENTIFIC AND EDUCATIONAL LITERATURE ON THE HISTORY OF PRINTING: APPROACHES TO THE REPRESENTATION OF THE MATERIAL

**N. A. Zubchonak**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

The article presents an overview of modern scientific and educational literature on the history of the Belarusian press; the features of the methodological approach to understanding factual material, historical phenomena and processes are determined.

***Key words:*** print; journalism; mass media; history; period; research; educational and methodological complex; methodological approach.

Даследаванне асаблівасцей развіцця сродкаў масавай інфармацыі ў розныя гістарычныя перыяды набывае асаблівую актуальнасць і значнасць па многіх прычынах. Па-першае, адбываецца пераасэнсавнне фактаў і па-

дзей, якія прамым чынам уплываюць на светапогляд сучаснага чалавека. Па-другое, развіццё тэхналогій адкрывае новыя магчымасці асваення даследчыцкага гістарычнага матэрыялу. Нарэшце, імклівымі тэмпамі адбываецца трансфармацыя камунікацыйных працэсаў увогуле і вельмі неабходна, каб усе гэтыя фактары садзейнічалі кансалідацыі грамадства праз традыцыйныя агульначалавечыя каштоўнасці і нацыянальна-дзяржаўныя прыярытэты на гістарычнай аснове.

Новае пакаленне навуковай і вучэбнай літаратуры характарызуецца разнастайнасцю метадалагічных падыходаў, шырынёй ахопу матэрыялу. Адкрываюцца магчымасці вывучэння раней невядомых альбо недаступных у ранейшыя часы матэрыялаў друку, гістарычных фактаў. Сёння пішацца гісторыя не толькі прэсы, але радыё, тэлебачання, інтэрнет-рэсурсаў. Даследаванні ў гэтым напрмку – асобная навуковая галіна.

Пры вывучэнні і вучэбнай прэзентацыі ў навучальных установах разнастайных аспектаў развіцця традыцыйных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі ў апошні час актуальнай з’яўляецца спецыяльная літаратура – вучэбна-метадычныя комплексы. Такія выданні аптымальна аб’ядноўваюць навуковы і метадычны матэрыял, які дапамагае больш эфектыўна засвойваць інфармацыю. Так, у 2003 г. выйшаў з друку першы такі дапаможнік «Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917). Вучэбна-метадычны комплекс» С. В. Говіна. На аснове сучаснай метадалогіі ў ім быў прадстаўлены агляд развіцця прэсы на тэрыторыі Беларусі з часоў выхаду першай газеты-аднадзёнкі «Навіны грозныя…» да журналістыкі савецкага часу [1].

У 2008 г. пад рэдакцыяй С. В. Говіна надрукавана яшчэ адно значнае выданне – «Канфесійны друк Беларусі. Вучэбна-метадычны комплекс» [2]. У кнізе прадстаўлены ўнікальны гістарычны матэрыял аб выданнях рэлігійнай скіраванасці. Даследаванне дадзенага віду прэсы да апошняга часу не праводзілася. У перыяд адлучэння царквы ад дзяржавы газеты і часопісы рэлігійных устаноў выходзілі ў фармаце самвыдата. Адраджэнне канфесійнага друку адбывалася паралельна з развіццём палітычных і культурных працэсаў у Беларусі ў канцы ХХ – пачатку ХХІ стст. У сістэме друкаваных сродкаў масавай інфармацыі гэта паўнавартасныя выданні, якія адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні духоўных і агульначалавечых каштоўнасцей, расказваюць аб дзейнасці рэлігійных устаноў і арганізацый. На тэрыторыі Беларусі сёння пражываюць прадстаўнікі каля 30 канфесій. Дзяржава на канстытуцыйным узроўні забяспечвае права кожнаму грамадзяніну на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі.

У дачыненні да даследавання дадзенага віду прэсы важнае масца належыць працам В. І. Шымоліна, у якіх упершыню ў беларускай навуцы

праведзена вывучэнне «Епархиальных ведомостей», газет праваслаўнага накірунку, якія выходзілі ў беларускіх губернiях з 1863 па 1918 гг. У змесце выданняў адлюстраваны працэс культурнага і духоўнага адраджэння беларускага народа ў другой палове XIX – пачатку XX стст. [2, 3]. Аўтар аргументавана даказвае, што на культурнае і духоўнае развіццё беларусаў праваслаўныя газеты аказалі вельмі значны ўплыў.

Змены дэмакратычнага парадку ў краіне на мяжы стагоддзяў безумоўна спрыялі станоўчым тэндэнцыям у навуцы. Так, стаў даступным кантэнт многіх выданняў, змяніліся погляды на асобныя гістарычныя факты і падзеі, што дазволіла праводзіць іх паглыблены аналіз. Асаблівасці развіцця перыядычнага друку на мяжы XIX–XX стст. разглядаюцца ў вучэбным дапаможніку «Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906–1916)». У выданні паказаны асаблівасці станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху на тэрыторыі Беларусі і фарміравання сістэмы прэсы [4].

Працэс станаўлення журналістыкі на беларускіх землях у XIV–XIX стст. прадстаўлены ў вучэбна-метадычным дапаможніку «Гісторыя беларускай журналістыкі XVI–XIX стагоддзяў. Дакументы і матэрыялы» [5]. Аналіз літаратурных і публіцыстычных тэкстаў дазваляе выяўляць заканамернасці развіцця сродкаў масавай інфармацыі, залежнасць іх функцыянавання ад палітычнага і духоўнага развіцця грамадства.

Аналіз друку ў перыяд станаўленя сацыялізму да пачатку Вялікай Айчыннай вайны разглядаецца ў вучэбна-метадычным комплексе «Беларуская журналістыка (1918–1941)» [6]. Працэс развіцця прэсы паказаны не толькі ў рэчышчы партыйна-савецкай ідэалогіі, але і ў кантэксце фарміравання сучаснай сістэмы СМІ, паколькі ў яе аснове сёння такія выданні, як «Звязда», «Беларуская вёска» («Сельская газета»), «Полымя», «Сталинская молодежь» («Знамя юности») і мн. інш. Сучасная беларуская журналістыка паспяхова развіваецца дзякуючы лепшым традыцыям прафесійнага вопыту, сфарміраваным у савецкі час.

Распрацоўка розных пытанняў гісторыі прэсы праводзіцца на факультэце журналістыкі пастаянна. Так, гісторыі друку перыяду нямецка-фашысцкай акупацыі прысвечаны вучэбны дапаможнік «Беларуская журналістыка ў гады Другой сусветнай вайны (1939–1945)» [7]. Аўтары дапоўнілі выданне новай актуальнай інфармацыяй з публікацый перыядычных выданняў, архіўных матэрыялаў. У кнігу ўключана вялікая колькасць ілюстрацый, у якіх адлюстраваны падзеі ваеннага часу.

Цікавасць да працэсу развіцця сродкаў масавай інфармацыі Беларусі вялікая і ў грамадзян іншых краін, якія навучаюцца тут. Неабходнасць

распрацоўкі спецыяльнай вучэбна-метадычнай літаратуры на рускай мове існуе пастаянна. Так, у 2022 г. быў надрукаваны дапаможнік па гісторыі беларускага друку для замежных студэнтаў «Белорусская журналистика (1563–2021)» [8]. Аўтары прадставілі кароткую гісторыю развіцця вядучых перыядычных выданняў Беларусі ў кантэксце важнейшых грамадска-палітычных і культурных працэсаў.

Даследаванне гісторыі развіцця сродкаў масавай інфармацыі будзе актыўна працягвацца. Гэтага патрабуе час, які вымушае нас па-іншаму падыйсці да ацэнкі некаторых факутаў і падзей мінулага з мэтай аб’ектыўнай трансляцыі актуальнага гістарычнага кантэнту. Матэрыялы друку і іншых СМІ – невычэрпная крыніца інфармацыі аб жыцці краіны, якую неабходна распаўсюджваць і навукова глыбока асэнсоўваць.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Говін С. В.* Гісторыя беларускай журналістыкі (1563-1917): вучэб.-метад. комплекс. Мінск: БДУ, 2003. 99 с.
2. *Шимолин В. И.* Духовные ценности православия в культуре белорусского народа. Системный анализ белорусских епархиальных ведомостей второй пол. XIX – нач. XX вв. Монография. Минск: Изд. центр БГУ, 2008. 159 с.
3. *Шимолин В. И.* У истоков белорусской печати: епархиальные ведомости второй половины XIX – начала XX вв. Минск: БГУ, 2010. 199 с.
4. *Зубчонак Н. А.* Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906–1916): дапаможнік. Мінск: БДУ, 2010. 99 с.
5. *Герасімчык І. А.* Гісторыя беларускай журналістыкі XVI–XIX стагоддзяў. Дакументы і матэрыялы: вучэб.-метад. дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2015. 223 с.
6. *Слука А. Г., Зубчонак Н. А.* Беларуская журналістыка (1918–1941): вучэб-метад. комплекс. Мінск: БДУ, 2015. 191 с.
7. *Дарашчонак П. Л., Конанава А. І.* Беларуская журналістыка ў гады Другой сусветнай вайны (1939–1945): дапаможнік. Мінск: БДУ, 2020. 199 с.
8. *Дорощенок П. Л., Коршук В. В.* Белорусская журналистика (1563–2021): пособие. Минск: БГУ, 2022. 135 с.